**І. Ільюшэнка**

# РОЛЯ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ (1921–1937) У ФАРМІРАВАННІ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

Развіццё нацыянальнага беларускага руху ў пачатку XX ст. сутыкнулася з істотнай перашкодай у сувязі з Рыжскім мірам 1921 г., што падзяліў беларускія землі, заходняя частка якіх апынулася ў складзе Польшчы. Паланізацыйная практыка ўлад паставіла перад беларускім народам пытанне аб захаванні нацыянальнай ідэнтычнасці. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывала Таварыства Беларускай школы (ТБШ).

Пачаткам дзейнасці ТБШ можна назваць 1 ліпеня 1921. Першым старшынёй стаў Аркадзь Смоліч. Яго змяніў пасля Тарашкевіч, які ў снежні 1921 года стварыў аддзяленне ТБШ у Радашковічах. Згодна з данымі дэпартамента асветы, у студзені 1922 г. у Сярэдняй Літве дзейнічала 178 беларускіх пачатковых школ, беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах, курсы для настаўнікаў, беларускія гімназіі ў Вільні і Радашковічах. У чэрвені–верасні 1921 г. былі наладжаны настаўніцкія курсы. Пасля далучэння Сярэдняй Літвы да Польшчы пазіцыі беларускай асветы значна аслаблі. З 514 беларускіх школ у заходнебеларускім краі засталося толькі 32, перастала дзейнічаць беларуская настаўніцкая семінарыя ў Барунах.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд існавалі 33 беларускія прыватныя школы, якія былі заснаваныя ў 1924–1925 гадах. Калі гімназіі знаходзіліся пад пратэктаратам ТБШ, іх скончыла 200 чалавек, а вучылася каля 3 000.

ТБШ стварала бібліятэкі, дамы-чытальні, клубы. Да канца 1920-х было заснавана 208 бібліятэк, а таксама 93 народныя дамы. Да сярэдзіны 1920–х гг. першай самай буйной акцыяй ТБШ была арганізацыя калектыўных заяў аб адкрыцці беларускіх школ. Да канца 1925 года іх колькась дасягнула 16 тыс. ТБШ накіроўвала выпускнікоў беларускіх школ у ВНУ БССР і Чэхаславакіі. Да 1926 года колькасць беларусаў, якія вучыліся ва ўніверсітэтах Чэхаславакіі, дасягнула 100 чалавек.

У час найбольшага ўздыму Таварыства мела каля 20 000 членаў. З-за таго, што гэтая арганізацыя была вельмі папулярнай, некаторыя палітычныя партыі, і асабліва камуністы, заўсёды стараліся мець сваіх людзей у ёй. Гэта давала ўладам прычыну для ўмяшання і паралізавання дзейнасці ТБШ.

Польшча ставілася негатыўна да ТБШ, сабатавала яе дзейнасць. Даходзіла да сфабрыкаваных палітычных спраў, у якіх арганізацыю абвінавачвалі ў камуністычнай і антыдзяржаўнай дзейнасці. Пасля актывізацыі працы ў 30 гадах і аб'яднання ТБШ з іншымі беларускімі арганізацыямі 22 снежня 1937 г. ТБШ было забаронена.

Такім чынам, зыходзячы з прыведзеных вышэй фактаў, можна казаць пра тое, што ТБШ было самай буйной арганізацыяй, якая мела вялікае значэнне ў фармаванні і абароне нацыянальнай ідэнтычнасці і беларускага народа на тэрыторыі Заходняй Беларусі.